УДК 811.161.3’276.6.62

# Марфалагічны спосаб утварэння ваенных тэрмінаў

Савіцкая І.У., Гаўрош Н.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Марфалагічны спосаб утварэння тэрмінаў вельмі прадуктыўны ў сучаснай беларускай мове; ён выступае і адной з асноўных крыніц папаўнення ваеннай тэрміналогіі. Гэта такі спосаб словаўтварэння, пры якім новыя назвы ўзнікаюць на базе ўжо вядомых слоў (асноў) і словаўтваральных афіксаў.

Вылучаюць два тыпы марфалагічнага тэрмінаўтварэння: афіксацыя і складанне. Да ***афіксацыі*** адносяцца наступныя падтыпы:

– суфіксальны (найбольш прадуктыўны). Большасць ваенных тэрмінаў утвараецца пры дапамозе наступных суфіксаў: -к- (*разведка, вывучка*), -н- (*батарэйны, батальённы*), -іст- (-ыст-) (*танкіст, артылерыст*), -нн- (*маскіраванне, разведванне*), -энн- (-енн-) (*акружэнне, узбраенне*), -льнік- (*шукальнік, назіральнік*), -чык- (*разведчык, наводчык*);

– прэфіксальны: *антыдэтанатар, дэзінфармацыя, дээскалацыя;*

– прэфіксальна-суфіксальны: *беспілотнік, прыстрэлка, прыгранічны;*

– нульсуфіксальны (бяссуфіксны): *абстрэл, налёт, напад, прарыў, зарад.*

Да ***складання*** адносяцца:

– асноваскладанне: *авіясувязь, авіязвяно, маскхалат, эвакапункт;*

– словаскладанне: *самалёт-снарад, пісталет-кулямёт, капсуль-запальнік;*

– складана-суфіксальны: *авіяносец, дальнабойнасць, дальнамершчык;*

– складана-нульсуфіксальны: *дальнамер, агнямёт, кулямёт;*

– абрэвіяцыя: *УР – умацаваны раён, ПАГ – палкавая артылерыйская група, САУ – самаходная артылерыйская ўстаноўка, КПП – кантрольна-прапускны пункт, ФВК – фільтра-вентыляцыйны камплект.*

Састаўной часткай ваенных тэрмінаў, утвораных шляхам складання, часта выступаюць грэка-лацінскія часткі ў значэнні прыметнікаў: авія- (*авіядэсант, авіябомба*), аўта- (*аўтамат, аўтадром*), мота- (*мотапяхота, мотастралковы*), контр- (*контратака, контрнаступленне*), радыё- (*радыёўзрывальнік, радыёмаяк*) і інш. У такіх тэрмінах могуць спалучацца словаўтваральныя элементы класічнай і заходнееўрапейскай моў *(контрманеўр, мотарэсурс, радыёпеленг),* класічнай і беларускай моў *(авіякулямёт, контрпадрыхтоўка, радыёперадатчык),* класічных моў *(дазіметр, піратэхніка, радыётэхнічны).*

Сярод суцэльнааформленых тэрмінаадзінак у ваеннай тэрміналогіі сустракаюцца і складаныя найменні чыста славянскага паходжання: *самалёт, самаходны, агнямёт, баяздольны, святловыпраменьванне, дальнамершчык, дальнабойны, агульнавайсковы.*